# ВЫВУЧЭННЕ БЕЛАРУСІ ЯК ВЕРАГОДНАГА ТЭАТРА ВАЕННЫХ ДЗЕЯННЯЎ (1810–1812)

*Вясной 1810 г., пасля зацвярджэння плана падрыхтоўкі Расіі да вайны з Францыяй, які быў распрацаваны ваенным міністрам генералам ад інфантэрыі М. Б. Барклаем дэ Толі, пачынаецца сістэматычнае вывучэнне тэрыторыі Беларусі як верагоднага тэатра ваенных дзеянняў. Гэта работа ўскладалася на афіцэраў Світы яго імператарскай вялікасці па кватэрмайстарскай частцы (далей — Світы). Падрыхтоўка да вайны вялася да лета 1812 г. і прайшла некалькі этапаў. Спынімся на вывучэнні Беларусі на працягу толькі аднаго 1810 года.*

## Правядзенне інжынерных разведак і пошукі месцаў для ўмацаваных лагераў і пазіцый

5 сакавіка 1810 г. ваенны міністр даручыў генерал-маёру Світы Б. М. Бергу агледзець усе месцы па напрамку ад Астрога праз Жытомір да Кіева і ад Пінска праз Мазыр да Дняпра. Берг павінен быў адзначыць усе спрыяльныя ваенныя пазіцыі, пачынаючы ад межаў Расіі. Каля Жытоміра яму даручылі выбраць месца для лагера арміі, якая складалася з 50 тыс. чалавек з раскіданымі палявымі ўмацаваннямі, з узаемнай абаронай. Другі ўмацаваны лагер загадвалася выбраць каля Мазыра, на корпус для 10–15 тыс. чалавек. Берг павінен быў выканаць заданне за кароткі тэрмін, таму дазвалялася не складаць «настоящей топографической карты», а толькі выканаць «брулионы главным местам», прадставіць прапановы па ўмацаваннях, а на падрабязнай карце Расіі адзначыць, «с которых они окружностей» [1]. Для дапамогі Бергу камандзіраваўся палкоўнік Світы Эйхен 1-ы, які атрымаў загад накіравацца ў Жытомір і там чакаць генерала [2].

Генерал-маёр Берг да таго часу займаўся «съемкой новой границы и расставлением пограничных столбов» Расіі з Аўстрыяй паводле канвенцыі, заключанай у г. Лембергу. 19 сакавіка ён здаў справы капітану Світы Я. Ф. Гофману і выехаў у Жытомір. 21 сакавіка 1810 г. галоўнакамандуючы арміі на захадзе генерал-лейтэнант Д. С. Дохтураў прызначыў Бергу замену [3].

У Жытоміры Эйхен 1-ы перадаў Бергу загад ваеннага міністра аб правядзенні рэкагнасцыроўкі. Для эканоміі часу Берг камандзіраваў Эйхена ў г. Дубна да генерал-маёра Світы С. А. Мухіна за планамі паўднёвых раёнаў (іх «подробно и в довольно большом масштабе» зняў Мухін). Берг разлічваў выкарыстаць папярэднюю здымку ў якасці асновы і толькі пераправерыць усе месцы «в натуре» [4].

Берг планаваў пачаць рэкагнасцыроўку з Пінска, куды і выехаў з Дубна. Адтуль ён перабраўся ў Мазыр, і далей «по сему направлению к р. Днепру, потом вниз по сей реке до Киева и наконец обратно чрез Житомир до Острога». Каб не губляць дарэмна часу, Берг выкарыстаў на пераезд уласныя 500 руб. асігнацыямі, якіх яму хапіла толькі да Мазыра. «...Мне весьма часто случаться будет ехать проселочными дорогами, — пісаў ён Барклаю дэ Толі, — где должен буду нанимать лошадей от места до места, которые теперь в нынешней распутице весьма дороги будут, тем более, *что в здешних местах все серебром платят*» (тут і далей курсіў мой. — **А. Л.**) [5]. Таму для выканання сакрэтнага задання Бергу выдзелілі 2 тыс. руб. асігнацыямі [6].

На працягу трох месяцаў (май—ліпень) Берг аб'ехаў вялікую прастору і склаў планы пазіцый. Разам з рапартамі ён адсылаў іх ваеннаму міністру, які прыспешваў генерала з хутчэйшым завяршэннем агляду [7].

У жніўні палкоўнік Эйхен 1-ы даставіў ваеннаму міністру складзены Бергам «план окружности г. Житомира и позиции оборонительной для армии из 50 тыс. чел.» [8]. Азнаёміўшыся з планам, Барклай дэ Толі адзначыў у ім «неудобность»: фронт умацаванага лаге-

ра быў звернуты ў асноўным на паўночны ўсход — на Мазыр і Кіеў, а не на захад. Таму ў сваім лісце Бергу ваенны міністр абураўся: «Таковое направление обороны тем менее приносит пользы, что г. Киев и Мозырь предполагаются быть укрепленными и, следовательно, служить будут обороною тыла избираемой близ Житомира военной позиции. *Сия позиция имеет быть основанием наступательных действий* и, следовательно, фронт оной должен быть обращен к местам, откуда неприятеля ожидать можно». Барклай дэ Толі даручыў Бергу зрабіць новы агляд наваколля Жытоміра ці сумежных з ім месцаў, выбраць з іх лепшае, скласці план «окружности и позиции оборонительной для 50 тыс. войска». Міністр прыспешваў генерала з выкананнем гэтага і ўсіх іншых даручэнняў, пасля чаго дазваляў прыбыць у Пецярбург «для личного по оным... объяснения» [9].

Амаль адначасова з Бергам 14 сакавіка 1810 г. ваенны міністр даручыў падпалкоўніку Світы Эйхену 2-му [10] агледзець усе месцы па Дзвіне ад Рыгі да Дынабурга, а палкоўніку Світы Вісціцкаму 3-му [11] — наваколле Будзілава. Абодва афіцэры павінны былі выбраць найлепшыя месцы для ўмацаваных лагераў для карпусоў на 30 тыс. чалавек з правіянцкімі запасамі: Эйхен 2-і — на 3 месяцы; Вісціцкі 3-і — на 2 або 4 месяцы. Пры выбары пазіцыі Эйхен 2-і павінен быў улічваць, каб «неприятель не осмелился действовать чрез Вильно на Витебск или через Минск на Ригу, не подвергая себя опасности нападения во фланг и тыл». Афіцэру прапаноўвалася агледзець месца пры вусці р. Еўсць: калі яно будзе спрыяльным для пабудовы ўмацаванняў, то ўсе запасы планавалася дастаўляць вадою па Еўсце. Барклай дэ Толі падкрэсліў, што ўмацаваны лагер абавязкова павінен быць на левым беразе Дзвіны, каб мець магчымасць дзейнічаць з яго наступальна.

У сваіх прадпісаннях ваенны міністр выклаў і асноўныя патрабаванні да лагернай пазіцыі. У асноўных рысах яны паўтараюцца ў загадах Эйхену 2-му і Вісціцкаму 3-му. «Лагерные укрепления должны быть раздельные, со взаимною обороною, — гаварылася ў прадпісанні Эйхену, — и на всякий случай иметь защиту с тыла закрытыми редутами или другими полевыми укреплениями, со флангов же быть совершенно обеспечены природою и искусством, а на правом берегу Двины против лагеря построить тет-де-пон, чтоб мосты наши через Двину не были подвержены ни малейшей опасности. Штурмовые и другие палисады во рвах и волчьи ямы перед фронтом весьма нужны; последние таким образом расположить, чтоб оне, не препятствуя вылазкам наших войск, задерживали неприятеля долее под перекрестным нашим огнем или принудили его атаковать на тех пунктах, где мы хотим. Местоположение представит военному искусству многие средствы расположить укрепления с целию, чтоб неприятель на тех местах, где наступать может, подвержен был в многократных направлениях сильному перекрестному огню, а наши войска, пехота и конница, могли свободно проходить в промежутки и в самую решительную минуту сражения нападать с успехом на атакующего неприятеля с флангов и в тыл».

Акрамя выбару пазіцый афіцэрам даручалася «с точностью обозреть все пространство земли от р. Виндавы чрез Шавлю и Поневеж до Двины» (для Эйхена 2-га) і «от р. Припети вдоль границ Минской губернии до Зап. Двины, и от границ Виленской губернии до Витебска, Рогачева и Друи» (для Вісціцкага 3-га); а таксама «исследовать состояние дорог, течение и свойство рек, и снять на плане подробно местоположение, с означением на карте выгодных военных позиций». Вісціцкаму таксама даручалася агледзець наваколле Барысава і Бабруйска, дзе першапачаткова планавалася «учредить сильно укрепленные передовые посты для авангарда, дабы чрез обладание Березиною иметь сообщение между Днепром и Двиною и защищать главные дороги». У дапамогу Вісціцкаму выдзелілі двух афіцэраў кватэрмайстарскай часткі і калонаважатага. Камандуючаму рэзервовай арміі генералу ад інфантэрыі М. А. Міларадавічу было прадпісана пры неабходнасці адкамандзіроўваць у дапамогу здольных для гэтага даручэння афіцэраў [12].

Па меры выканання задання афіцэры прадстаўлялі ваеннаму міністру планы месцаў з разлікам колькасці патрэбных для работ салдатаў. Ужо вясной бягучага года планавалася пачаць будаўнічыя работы. На патрэбы Эйхена 2-га і Вісціцкага 3-га, якія павінны былі пра-

водзіць работы пад выглядам выпраўлення падрабязнай карты, выдаткоўвалася па 500 руб. асігнацыямі.

У канцы мая падпалкоўнік Эйхен 2-і прадставіў свой план умацаванняў. Ваенны міністр патрабаваў, каб усе раскіданыя ўмацаванні мелі абарону з тылу і былі акружаны воўчымі ямамі. «На плане вашем, — пісаў міністр 3 чэрвеня, вяртаючы план, — изображено красною краскою сомкнуть сзади главные редуты и прибавить еще отдельных укреплений на случай, ежели неприятель одним завладеет, то чтоб действиями на оный из других был выгнан». У адпаведнасці з гэтым, Эйхену 2-му загадвалася скласці падрабязныя чарцяжы. Дазвалялася, што ўмацаванні з тылу могуць быць слабейшымі ў профілі за перадавыя, але яны абавязкова павінны быць самкнёныя [13].

11 жніўня Эйхен 2-і, «обозревши и снявши в предписанном... пространстве все значущие дороги и прочее», прыбыў у Дынабург. Заставалася зняць некаторыя дарогі і месцы ў Курляндскай губерні [14]. 22 жніўня Эйхен 2-і быў ужо ў Ілуксце, адкуль скардзіўся на здароўе: «Болезненные мои припадки, усиливающиеся с приближающеюся осенью, не позволяют мне, особенно в сырую погоду, делать большие переезды, почему не прежде как чрез 2 или 3 недели туда (в Ригу. — А. Л.) прибыть надеюсь». Але, нягледзячы на хваробу, 28 жніўня Эйхен 2-і паведаміў міністру аб заканчэнні работ. 17 верасня ён атрымаў дазвол Барклая дэ Толі прыехаць у Пецярбург [15].

26 верасня аб завяршэнні работ рапартаваў і палкоўнік Світы Вісціцкі 3-і. Вынікам яго працы з'явілася карта Мінскай губерні «с описанием военного обозрения», а таксама знятыя «инструментально с окружною ситуациею планы города Минска и местечек Несвижа, Березино и Белынич». Вісціцкі таксама засведчыў перад Барклаем дэ Толі «особенное усердие к службе и ревностную деятельность» сваіх памочнікаў — афіцэраў кватэрмайстарскай часткі паручніка В. І. Краўзе, падпаручніка Ф. К. Цурмілена і калонавважатага Вашуціна [16].

Апісанне, якое было складзена пад кіраўніцтвам Вісціцкага 3-га, мела дзве часткі. Першая, пад назвай «О крепостях, временных укреплениях, лагерных местах и военных постах в Белорусских и Минской губерниях 1810 г.», утрымлівае падрабязную інфармацыю не толькі аб ваенным палажэнні тых ці іншых месцаў, але і апісанне беларускіх гарадоў (гістарычныя звесткі, колькасць насельніцтва, дамоў, аптэк, цэркваў, касцёлаў і інш.). Другая частка — «О дорогах, переправах чрез реки и других коммуникациях» — апісвае галоўныя паштовыя, прасёлачныя і інш. грунтавыя дарогі, месцы пераправаў цераз рэкі і г. д. [17].

## Правядзенне рэкагнасціровак<br>І разведак уздоўж заходняй граніцы

30 сакавіка 1810 г. в. а. генерал-кватэрмайстара генерал-маёр М. С. Вісціцкі 2-і прадставіў ваеннаму міністру спіс кватэрмайстарскіх афіцэраў, якія прызначаліся для правядзення рэкагнасцыровак [18]. 31 сакавіка ён быў зацверджаны імператарам. У сваю чаргу ваенны міністр даў Вісціцкаму кароткую інструкцыю: «В предписаниях ваших частным начальникам вы объясните им важность возлагаемых на них поручений и что они *обязаны сохранять настоящую цель в непроницаемой тайне*, а занятиям своим могут давать вид, что им предписано исправлять погрешности общей подробной карты Российской империи» [19]. Акрамя ваенна-статыстычнага апісання ім даручалася правесці здымку пазіцый, якія прадстаўлялі «выгоды к удобнейшей обороне того пространства».

Уся прастора ад Заходняй Дзвіны і Дняпра да граніц Прусіі, Княства Варшаўскага, Галіцыі і Малдавіі была падзелена на 5 частак: ад Рыгі да г. Дынабурга; ад г. Дынабурга да м. Бешанковічы; ад м. Бешанковічы да г. Старога Быхава; ад г. Старога Быхава да вусця р. Прыпяці; ад вусця р. Прыпяці да г. Крамянчуга. Для правядзення рэкагнасцыровак у кожную частку былі прызначаны групы па шэсць афіцэраў. У першую частку накіроўваліся палкоўнік Струкаў, паручнік Г. Т. Іваноў, падпаручнікі Ікскюль 2-і, Кацэбу, П. А. Кнорынг і калонавважаты барон Зальц; у другую — падпалкоўнік барон І. І. Дзібіч, паручнік А. А. Брун, падпаручнікі Траскін 1-ы, П. І. Месінг, калонавважатыя А. І. Месінг і Странкоўскі; у трэцюю — маёр Эбергард, па-

ручнік Ф. Ф. Маркевіч, падпаручнікі Дз'яканаў, Лахніцкі, Энгольм і калонавважаты Стукенберг; у чацвёртую — маёр Саснін, капітан М. М. Гарцінг, падпаручнікі Гернгрос, Фарафонтаў і калонавважатыя Парыс, Мілаш; у пятую — палкоўнік П. С. Емяльянаў, паручнікі Сгурамалі, М. П. Акунёў, Багдановіч, падпаручнік князь Абаленскі і калонавважаты Трыдгоф 1-ы [20].

З мэтай больш паспяховага выканання даручэння ў пачатку красавіка 1810 г. Вісіцкі звярнуўся да міністра ўнутраных спраў В. П. Казадаўлева з просьбай выдаць адкрытыя лісты афіцэрам Світы, як гэта было ў мінулым, 1809, годзе. Але аказалася, што 5 кастрычніка 1809 г. Аляксандр І падпісаў указ, якім забаранялася браць падводы ў абывацеляў. «Ни для кого из проезжающих нарядов обывательских лошадей не делать, — гаварылася ва ўказе, — но предоставлять нанимать оных, кто пожелает большое число иметь, а подорожные выдавать на такое число лошадей, какое кому по чину следует, да и то по таким трактам, где на станциях достаточное на то число лошадей содержится. Отправляющимся же по таким дорогам, где лошадей на станциях не много, выдавать и подорожные не иначе, как соображаясь с числом лошадей, сколько на сих дорогах есть» [21]. Таму Казадаўлеў, мяркуючы, што калі афіцэры ў час сваёй экспедыцыі «будут неразлучны и не разделены по партиям, то наряд обывательских лошадей в столь знатном количестве будет для поселян весьма отяготителен», не рашыўся задаволіць гэтае патрабаванне. Ён прадставіў просьбу Вісіцкага на разгляд Камітэта міністраў, які прапанаваў Барклаю дэ Толі падрыхтаваць даклад імператару [22].

11 красавіка 1810 г. імператар загадаў выдаць афіцэрам неабходныя адкрытыя лісты, каб яны маглі атрымліваць без затрымкі абывацельскія падводы за ўказаныя прагоны. На прагоны дазвалялася выкарыстаць да 13 тыс. руб. серабром. У той жа дзень ваенны міністр звярнуўся да Казадаўлева, і неабходныя адкрытыя лісты былі выдадзены генералу Вісіцкаму [23].

Многія афіцэры Світы даволі «творча» падышлі да выканання задання ваеннага міністра. Асабліва вызначыўся ў гэтым плане падпалкоўнік І. І. Дзібіч. З мэтаю сабраць самыя дакладныя звесткі пра даручаную яму частку «Польшчы», афіцэр вырашыў азнаёміцца з бібліятэчнай літаратурай. У Дынабургу ён звярнуўся да езуітаў Раялінскага і дэ Вітрэ. У час «шчырай размовы» з імі Дзібіч даведаўся пра «обстоятельства, совершенно сходные с ... правилами тайного общества». 5 мая 1810 г. Дзібіч даслаў Барклаю дэ Толі рапарт са сваімі разважаннямі [24]. 28 мая ваенны міністр паведаміў, што змест яго пісьма *«мало соответствует цели сделанного вам поручения»*, і на будучыню параіў дасылаць рапарты «с планами о подробнейшем осмотре мест и дорог на определенном для вас пространстве» [25].

Што ж даносіў падпалкоўнік Дзібіч? Рапарт будучага генерал-фельдмаршала ўтрымліваў ацэнку палітычных настрояў жыхароў паўночнай Беларусі, Эстляндыі і Ліфляндыі. У прыватнасці, ён пісаў: *«Простой народ уважает Наполеона как будущего своего избавителя и представляет себе, что им изгнаны будут дворяне, а крестьяне получат свободу, по понятию сих людей состоящую в беззаконной вольности. ... По всем сим причинам дворянство и помещики опасаются, чтобы народ не забунтовал, когда удалось бы неприятельским, а особливо французским, армиям приблизиться к сим границам»*. Таму Дзібіч раіў звярнуць больш пільную ўвагу на становішча «внутренних наших губерний». Асаблівую небяспеку, на яго думку, выклікаюць польскія губерні. *«Поляки забавляются разными слухами,* — пісаў Дзібіч, — *а между прочим говорят, будто б войска наши уже были в сражении с ними и отступили "с значущим уроном". С некоторого времени вошли во всеобщее почти употребление красные шапки и иезуиты, хотя и в сем весьма осторожны, дали приметить, что тем воздают честь цвету польских королей. Впрочем, несогласия между русскими и поляками везде приметны»* [26].

Безумоўна, гэта не зусім тое, што чакаў ад Дзібіча ваенны міністр. Тым не менш, прадстаўленая падпалкоўнікам інфармацыя толькі пацвярджала думку Барклая дэ Толі адносна характару вайны, саюзнікаў і магчымых паводзін насельніцтва заходніх губерняў [27].

## Складанне генеральнай карты пагранічнай прасторы
(жнівень 1810 — верасень 1811 гг.)

На працягу 1810 г. афіцэрамі Світы была праведзена вялізная праца па здымцы заходняй пагранічнай прасторы. Пасля завяршэння першага этапу рэкагнасцыровак (жнівень 1810 г.) надышоў час складання «генеральной карты, с подробнейшим объяснением всех замечаний по каждой позиции». 21 жніўня 1810 г. Валконскаму даручалася прызначыць здольных афіцэраў Світы, якія пад кіраўніцтвам генерал-маёра Вісціцкага «со всею точностию старались приводить оное в исполнение». Ваенны міністр пісаў: «Для составления сего плана назначенные вами чиновники имеют начертить генеральную в большом размере военную карту того пространства, дабы на оной можно было обозначить важнейшие позиции с их окрестностями, в местечках и селениях цифрами число домов, все сообщения дорог, течение рек и прочее, к чему наиудобнее способствовать могут имеющиеся о сем местоположении карты, коих только стоит скопировать в увеличенном масштабе». Да гэтай карты патрабавалася прыкласці ваенна-тапаграфічнае і статыстычнае апісанне месцаў паміж Заходняй Дзвіной і Днястром, а таксама выпраўленыя планы, «особенно каждой предполагаемой военной позиции, с подробным описанием их слабых и выгодных положений и цели, для коей оные предназначаются» [28].

Для выканання работы Барклай дэ Толі перасылаў рапарты і планы ад кіраўнікоў аддзяленняў, якія праводзілі рэкагнасцыроўку. Міністр таксама загадаў палкоўніку Емяльянаву і маёру Эбергарду з'явіцца да Валконскага, які да 1 верасня разгледзеў іх работы [29]. Валконскі лічыў, што дастаўленыя афіцэрамі звесткі недастатковыя («упущение многих дорог») і маюць недахопы («глазомерное снятие» замест інструментальнай здымкі пазіцый). Таму кіраўнік кватэрмайстарскай часткі паўторна накіраваў афіцэраў да іх дыстанцый. Рапартуючы пра гэта ваеннаму міністру, Валконскі наступным чынам тлумачыў задачу афіцэраў: «1) для пополнения упущенных ими дорог, сходственно с данною им от меня картою, содержащею в себе помянутые, не описанные ими, дороги, и с предписанием от меня осмотреть и описать таковые же, могущие найтиться в натуре, не показанные на вышесказанной карте, и 2) для снятия инструментально всех военных позиций, вынося их на особенные планы с означением их на карте литерами, особенною краскою и в приличном масштабе, полагая (сообразно с съемкою Финляндии г. ген.-лейт. и кав. Штейнгелем) 100 саж. в англ. д. с подробным описанием о свойствах сих мест, расстояниях, отношениях и сообщениях между оными». Такімі ж правіламі павінны былі карыстацца і іншыя афіцэры, якія выконвалі рэкагнасцыроўку — палкоўнік Ф. Ф. Даўрэ і маёры Саснін і Чаркасаў. Для выканання работ Валконскі прасіў у ваеннага міністра дадаткова 10 тыс. руб. асігнацыямі, а таксама распараджэння аб прадастаўленні афіцэрам Світы з боку дывізійных камандзіраў піянерных рот [30].

Работы па зводзенні картаграфічных матэрыялаў праводзіліся ў чарцёжнай Дэпо карт пад кіраўніцтвам палкоўніка Світы Даўрэ. У аснову генеральнай карты ляглі матэрыялы рэкагнасцыровак 1810 г. з дыстанцый: Даўрэ — ваеннае апісанне і 6 планаў; падпалкоўніка Чаркасава — 3 планы; памерлага маёра Эбергарда — 17 планаў; падпалкоўніка Сасніна — 10 планаў і палкоўніка Емяльянава — 1 план. Але паколькі карта была «нанесена прямо с материалов, привезенных офицерами, то она не может иначе быть названа, как брулионом». Акрамя таго, пры складанні карты выкарыстоўваліся розныя картаграфічныя матэрыялы і матэрыялы рэкагнасцыровак больш позняга часу [31].

Такім чынам, карта планавалася вельмі падрабязнай. Але 4 верасня 1810 г. Валконскі фактычна атрымаў загад спыніць частку работ па складанні карты, паколькі на гэта не было часу. «Нет никакого сомнения, что подробные карты полезны, — пісаў яму Барклай дэ Толі, — но для их сочинения надобно сделать множество астрономических наблюдений и вычислений, множество тригонометрических съемок; нанеся на бумаге ткань астрономическую и тригонометрическую, должно еще делать съемки геометрические и наносить на карты те предметы, кои долженствуют быть на ней изображенными. Всё сие давно уже известно, но известно также и то, что *на сие потребно несколько лет*, а обстоятельства Военного мини-

стерства и намерения мои по части государственных дел, Высочайше мне вверенных, не всем известны. Соображая теперешнее положение дел, я нахожу, *что самое драгоценное есть время»* [32]. Таму складанне дакладных карт трэба пакінуць у баку, а за аснову ўзяць тыя карты, што ёсць, павялічыць іх і *«пополнять их по глазомеру»*.

У час рэкагнасцыровак афіцэры Світы павінны не толькі складаць карты, але і даследаваць пазіцыі, якія могуць паўплываць на ход ваенных дзеянняў, на ўсе магчымыя сродкі забеспячэння войскаў харчаваннем, утварэння рухомых і стацыянарных крам. Такім чынам, Барклай дэ Толі патрабаваў правядзення статыстычнага, фізічнага і ваеннага апісання магчымага тэатра вайны. Для выканання гэтага даручэння прапаноўвалася выкарыстоўваць звесткі, якія можна атрымаць ад мясцовага начальства, ад земскай паліцыі і кватэруючых там войскаў. *«Поляки*, — падказваў Барклай дэ Толі Валконскаму, — суть *люди давно образованные*, следовательно, у них есть межевые планы, поземельные записки и разные документы, которыми искусный квартирм. офицер при средствах, данных ему правительством, воспользоваться может». Што тычыцца дакладнай здымкі, то яе рэкамендавалася праводзіць у адзіным выпадку — калі дазваляе час. «Можно иногда употребить при съемках и инструменты, — пісаў ваенны міністр, — ежели только г. квартирм. офицеры найдут, что они в рассуждении времени, успеть могут кончить данное им препоручение, ибо все сие должно быть совершено ещё нынешним годом. *Сочинение же точнейших карт мы оставим, пока мы будем иметь более времени и офицеров, на которых можно бы возложить столь важное и тайне подлежащее дело»* [33]. Барклай дэ Толі прыспешваў генерал-кватэрмайстара з выкананнем гэтых работ да зімы, а на наступны год прапаноўваў пакінуць толькі менш значныя працы.

Для больш паспяховага ажыццяўлення работ па «исправлению подробной карты России» Валконскі прасіў дапамогі з боку ваеннага міністра і міністра паліцыі. 19 верасня А. Балашоў прадпісаў грамадзянскім губернатарам 12 заходніх губерняў і абласцей аб выдзяленні афіцэрам Світы служачых штатных каманд (калі не будзе паблізу піянерных і вайсковых частак) для правядзення інструментальнай здымкі. Пры гэтым міністр паліцыі раіў не паслабляць штатных каманд, «дабы чрез то не было остановки по делам гражданского управления». У сваю чаргу Барклай дэ Толі загадаў карпусным, дывізіённым і іншым вайсковым начальнікам таксама аказваць садзеянне афіцэрам Світы [34].

Матэрыялы новых рэкагнасцыровак адразу адсылаліся да палкоўніка Даўрэ, які наносіў іх на карту. Вынікам працы картографаў стала «подробная карта границ Российской империи между морями Балтийским и Черным, в 55 листах», якая 12 верасня 1811 г. была прадстаўлена Валконскаму [35].

Такім чынам, вывучэнне тэрыторыі Беларусі (усходняй, цэнтральнай і паўднёвай частак) як магчымага тэатра ваенных дзеянняў пачалося толькі вясной 1810 г. Яно праводзілася ў адпаведнасці з планам падрыхтоўкі да вайны з Францыяй, распрацаваным М. Б. Барклаем дэ Толі. Вывучэнне Беларусі ажыццяўлялася па некалькіх напрамках: інструментальныя геаграфічныя здымкі; ваеннае апісанне мясцовасці; складанне карт. Але работы праводзіліся ў абмежаваныя тэрміны, а таму іх якасць была недастаткова высокай. Гэта адбілася на расійскіх картах, складзеных «на глаз».